ІВАН ЯКУБОЎСКІ, БРАНЯТАНКАВЫ МАРШАЛ

Іван Ігнатавіч Якубоўскі (7 студзеня 1912 года, па старым стылі — 25 снежня 1911-га, вёска Зайцава, цяпер у Горацкім раёне Магілёўскай вобласці — 30 лістапада 1976 года, Масква) — савецкі военачальнік, Маршал Савецкага Саюза. Двойчы Герой Савецкага Саюза, Герой ЧССР. Беларус. Працаваў па найме ў вёсцы, скончыў сельскую школу. Затым — два курсы Аршанскага педагагічнага тэхнікума. У 1932 годзе прызваны ў Чырвоную Армію. Скончыў Беларускую аб'яднаную ваенную школу імя М.І. Калініна ў Мінску ў 1934 годзе, накіраваны служыць камандзірам вучэбнага ўзвода ў 27-ю Омскую Чырванасцяжную стралковую дывізію (Віцебск). Служыў у Беларускай ваеннай акрузе — камандзір танкавага ўзвода, камандзір танкавай роты, начальнік штаба танкавага батальёна, выкладчык Пухавіцкага пяхотнага вучылішча. Камандаваў танкавай ротай у Польскім паходзе Чырвонай Арміі ў верасні 1939 года ў складзе войскаў Беларускага фронту і ў савецка-фінскай вайне 1939-1940 гадоў. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Удзельнічаў у абарончых баях у Беларусі, у абароне Мінска, ваяваў у асаджаным Магілёве, камандаваў танкавым палком, брыгадай, корпусам. Па-геройску змагаўся на Варонежскім, Бранскім, Цэнтральным, 1-м Украінскім франтах у Курскай бітве на арлоўскім напрамку, бітве за Днепр, у вызваленні Кіева і Фастава. За гераізм у баях за Фастаў палкоўніку І.І. Якубоўскаму 10 студзеня 1944 года прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Вясной 1944 года танкавая брыгада палкоўніка Якубоўскага паспяхова дзейнічала ў Праскураўска-Чарнавіцкай наступальнай аперацыі. Удзельнічаў у Львоўска-Сандамірскай і Вісла-Одэрскай аперацыях. За геройскія дзеянні ў Львоўска-Сандамірскай аперацыі І.І. Якубоўскаму ў другі раз прысвоена званне Героя Савецкага Саюза ўказам ад 23 верасня 1944 года. Удзельнічаў у Берлінскай і Пражскай аперацыях. Некалькі разоў быў паранены, гарэў у танку. Пасля вайны — на розных камандных пасадах. З красавіка 1967 года — першы намеснік міністра абароны СССР, з ліпеня 1967-га — адначасова і Галоўнакамандуючы Аб'яднанымі ўзброенымі сіламі дзяржаў — удзельніц Варшаўскага дагавора. 12 красавіка 1967 года яму прысвоена званне Маршала Савецкага Саюза. Адзіны беларус, які меў такое высокае воінскае званне.

«Усё магло пайсці па-іншаму»

За два гады да першай сусветнай вайны, 7 студзеня 1912 года, у сям'і беларускага селяніна Ігната Лявонавіча Якубоўскага нарадзіўся сын Іван. Нічым не вызначалася нараджэнне яшчэ аднаго, шостага, дзіцяці ў нізенькай, пакрытай саломай, чатырохсценнай хаціне. Бацька — нязменны пастух у вёсцы Зайцава Горацкага павета на Магілёўшчыне. Маці, Акуліна Андрэеўна, хварэла, памерла ў сямнаццатым. Хатнія клопаты пра вялікую селянскую сям'ю ляглі на плечы жонкі старэйшага сына, Мікіты, Агаф'і Захараўны, якая прыклала нямала працы для выхавання дзяцей. Калі зазірнуць наперад, немагчыма абысці маўчаннем двух братоў Якубоўскага — радавога Аляксандра, які загінуў у баях у сорак першым, і Кірылу, камісара палка, які загінуў у сорак другім у баях пад Ржэвам. У 1944 годзе за сувязь з партызанамі гітлераўцы расстралялі Агаф'ю Захараўну разам з дваццацігадовай дачкой Аксінняй. Чатыры трагічныя смерці толькі на адну сям'ю простых беларускіх сялян.

...Першы клас школы супаў для малодшага сына сям'і Якубоўскіх з першым мірным годам пасля грамадзянскай вайны. Восенню ў простай кашулі, у лапцях, з букваром хлопчык адпраўляецца ў школу. Дзесяць кіламетраў кожны дзень у адзін канец з акрайцам жытняга хлеба, у любое надвор'е... Сем класаў скончаны. Сям'я ледзь-ледзь перабіваецца з хлеба на квас. Бацька ўсё часцей пагаворвае: «Ці не пара канчаць з гэтым, Ваня?» У трыццатым сяло стала калгасным, а камсамолец Іван Якубоўскі абіраецца сакратаром куставой ячэйкі Макар'еўскага сельсавета.

Не адразу наладзілася калгаснае жыццё. Але моладзь пацягнулася да вучобы. У большасці сялян не было спраўных ботаў ці чаравікаў. Абутак у літаральным сэнсе здабываўся ў лесе. З лыка плялі лапці, якія называлі сліпамі. У такім абутку і прыйшоў у павятовы горад Горкі Іван Якубоўскі, каб здаць дакументы ў найстарэйшую беларускую сельскагаспадарчую акадэмію.

> *— Не ўдалося мне навучыцца на агранома, і не таму, што я не мог бы здаць прыёмныя іспыты, — напіша шмат пазней у сваёй кнізе ўспамінаў «Зямля ў агні» Іван Ігнатавіч. — Добра прайшоў я па фізіцы і хіміі, і, магчыма, усё было б па-іншаму, ды падаспелі іншыя справы. Жыццё было цяжкае. Прыйшлося пайсці працаваць на цагляны завод. Пазней райкам камсамола паслаў мяне на вучобу ў Оршу, у педагагічны тэхнікум, і я рыхтаваўся стаць настаўнікам. Адвучыўся два гады. Мяне, у той час кандыдата ў члены партыі, выклікалі ў райкам і паведамілі хвалюючую вестку пра тое, што пасылаюць у армію, што ёсць рашэнне аб умацаванні вайсковых радоў партыйнымі камандзірскімі кадрамі. Прайшоў адборачную і медыцынскую камісіі, а на мандатную паехаў у Мінск. Можаце ўявіць маё здзіўленне, калі я нечакана ўбачыў за сталом камісіі героя грамадзянскай вайны Сямёна Канстанцінавіча Цімашэнку. Ну, думаю, калі сам Цімашэнка прыехаў, значыць, важная справа. Узнёслы настрой змяніўся сумненнем — раптам не падыду. Аднак падышоў. На камісіі мне сказалі, што педтэхнікум прыйдзецца пакінуць і пайсці па дарозе Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі.*

Якубоўскага залічваюць у Аб'яднаную Беларускую ваенную школу імя М.І. Калініна. Добрасумленна, упарта авалодвае ён майстэрствам ваеннай прафесіі. Яго лічаць лепшым спартсменам.

Майстэрства ваеннай прафесіі

Увосень 1934 года ў Мінску на плошчы Свабоды камкор С.К. Цімашэнка зачытаў перад строем загад аб выпуску лейтэнантаў, падпісаны намеснікам наркама абароны СССР М.М. Тухачэўскім. Менавіта на гэтай плошчы праз сем гадоў, у чэрвені 1941 года, капітану Якубоўскаму давядзецца прымаць першы бой з грозным ворагам. Але да гэтага былі яшчэ шэсць гадоў службы ў БВА, у 27-м артпалку 27-й Омскай двойчы Чырванасцяжнай стралковай дывізіі, якой тады камандаваў герой грамадзянскай вайны, кавалер чатырох ордэнаў Чырвонага Сцяга С.С. Вастрацоў.

Кіраўніцтва дывізіі ўлічвае якасці выпускніка-выдатніка, выкладзеныя ў характарыстыцы, і прызначае яго камандзірам вучэбнага ўзвода. У яго падначаленні 35 чалавек. На ўзбраенні — чатыры 122-міліметровыя гаўбіцы. Камандзір дывізіёна Кабатчыкаў дае выдатны водгук маладому камузвода, адзначае трывалыя веды, патрабавальнасць да самога сябе і да байцоў, яго педагагічную жылку. Неўзабаве ўзвод выходзіць на першае месца ў палку і дывізіі. Якубоўскага накіроўваюць на Ленінградскія Вышэйшыя Чырванасцяжныя бранятанкавыя курсы ўдасканалення камандзіраў РСЧА.

За сем напружаных месяцаў чарговай вучобы ён авалодвае майстэрствам ваджэння танка, навыкам стральбы і кіравання танкавымі падраздзяленнямі. У 23 гады ў 16-й лёгкатанкавай брыгадзе Якубоўскі камандуе танкавым узводам, а затым ротай вучэбна-танкавага батальёна. З гэтага часу яго запалам, яго клопатам, радасцю і горам, часам нават яго жыллём становіцца цесная сталёвая скрынка баявой машыны. У трывожны час ішло станаўленне будучага маршала.

Першая сутычка з ворагам у раёне плошчы Свабоды. Мінск 26.06.1941.

Восенню 1939 года на пасадзе камандзіра танкавай роты Іван Ігнатавіч прымаў удзел у вызваленчым паходзе ў заходнія вобласці Беларусі. А зімой 1939/1940 гадоў ён атрымаў баявую практыку ў ходзе савецка-фінскай вайны. Ротны Якубоўскі ваяваў у той час у складзе 22-га лёгкатанкавага палка.

Неўзабаве — вяртанне на родную беларускую зямлю. Спачатку — у Пухавічы, у пяхотнае вучылішча на пасаду старшага выкладчыка аўтабранятанкавай справы, а потым, у красавіку 1941-га, пад Мінск, у Чырвонае Урочышча, дзе ён прыняў танкавы батальён у 26-й танкавай дывізіі, якой камандаваў генерал Віктар Цімафееві Обухаў.

«Бліжэйшы наш палігон знаходзіўся ў раёне населеных пунктаў Малы і Вялікі Трасцянец. Там, разбіўшы лагер у лесе, мы і займаліся ваеннай вучобай аж да 21 чэрвеня», — успамінаў І.І. Якубоўскі.

З ворагам — твар у твар

А потым прыйшоў дзень 22 чэрвеня 1941 года. Іван Якубоўскі — камандзір танкавага батальёна.

У хуткацечных баях 24—26 чэрвеня 1941 г. на блізкіх подступах да сталіцы Беларусі перад капітанам Якубоўскім была пастаўлена задача ў складзе экіпажаў сямі танкаў Т-26 ліквідаваць варожы дэсант, які прарваўся ў раён плошчы Свабоды. На працягу трох гадзін задача была выканана. Затым баі працягваліся ў раёне завода імя Варашылава і Чырвонага Урочышча. Полк страціў у баях за Мінск шэсць сваіх танкаў, а варожых знішчыў звыш дзесяці. З захаду Мінск прыкрывала 64-я стралковая дывізія палкоўніка С.І. Іаўлева, а з паўночнага захаду — 100-я стралковая дывізія генерала І.М. Русіянава. Менавіта ў 100-й стралковай дывізіі ўпершыню ў гады Вялікай Айчыннай у барацьбе з варожымі танкамі былі ўжытыя бутэлькі з гаручай сумессю. Іх выкарысталі два капітаны: беларус Ф. Каўрыжка і ўкраінец В. Цяртычны. У наступныя дні 51-ы танкавы полк Якубоўскага вёў цяжкія абарончыя баі на рацэ Бярэзіне і пры абароне Магілёва. Тут полк Івана Ігнацьевіча ўпершыню ў гады вайны захапіў у палон каля 400 гітлераўцаў.

Першую баявую ўзнагароду — ордэн Чырвонага Сцяга — у суровым 1941 годзе падпалкоўнік І.І. Якубоўскі атрымаў менавіта ў баях за Магілёў.

Ён праяўляе асабістую адвагу і ініцыятыву. Пазней на пасадзе камандзіра палка і намесніка камандзіра 121-й танкавай брыгады ўдзельнічае ў баях на Бранскім і Паўднёвым франтах. Абараняе Маскву.

Увесну 1942 года Іван Ігнатавіч прызначаецца камандзірам 91-й асобнай танкавай брыгады, якая пачынае фарміравацца ў сакавіку. 20 чэрвеня накіроўваецца на Паўднёва-Заходні фронт. Там рэзка пагоршылася становішча, і нашы войскі, стомленыя баямі, вымушаны былі адыходзіць. Брыгада перакідваецца ў Валаконаўку. Ёй было загадана заняць абарону і прыкрываць 169-ю стралковую дывізію 28-й арміі, якая адыходзіла на ўсходні бераг Аскола. Забяспечваючы адыход стралковых часцей, брыгада вяла бой з адкрытымі флангамі, бо суседзяў побач не аказалася, што вельмі пагаршала становішча. На вузкім участку танкісты стрымлівалі націск гітлераўскай дывізіі, пастаянна падвяргаючыся ўдарам варожых бамбардзіроўшчыкаў.

1 ліпеня праціўнік правёў магутную бамбёжку з пікіравання і пад штармавым накатам артылерыйскага агню ажыццявіў камбінаваную атаку пяхоты і танкаў. Але варожыя машыны, наткнуўшыся на міннае поле, закладзенае ноччу мотастралкамі, павярнулі і падставілі свае барты пад прыцэльны агонь нашых процітанкавых гармат і бранябойшчыкаў. Савецкія байцы не завагаліся, падпусцілі машыны ворага як мага бліжэй і ўдарылі па ім усім, чым маглі. Танкі гарэлі. Гітлераўцы выклікалі авіяцыю і працягвалі атакі. Мужна змагалася маладая брыгада, не зрабіўшы ні кроку назад. Батарэі біліся да апошняга снарада, мотастралкі кідаліся ў рукапашную. Былі моманты, калі танкі праціўніка даходзілі да камандпункта. Камандзір брыгады праяўляў моцную волю, уменне і вопыт. Ён давяраў байцам не менш, чым яны давяралі яму.

Беспярэчна выконваліся ўсе яго каманды. Усе ведалі: камбрыг разам з імі, побач, камандуе, значыць, верыць у перамогу. У адным з баёў супрацьтанкавая міна выбухнула пад колам аўтамабіля. Якубоўскі быў кантужаны, атрымаў першую дапамогу і ўсю ноч кіраваў пераправай. Такім яго запомнілі ля Аскола.

Дзе Якубоўскі — там поспех

Гэта былі цяжкія бітвы нашых войскаў з ворагам на далёкіх подступах да Сталінграда. Пачалася найвялікшая бітва ў міжрэччы Волгі і Дона, роўнай якой не ведала сусветная гісторыя. Напружанасць узброенай барацьбы ўзрастала з кожным днём. Цэнтрам яе стаў Сталінград. Змагаючыся пад дэвізам «За Волгай для нас зямлі няма!», савецкія войскі адбілі люты націск ворага і нанеслі сакрушальны ўдар у адказ. Сіламі трох франтоў — Паўднёва-Заходняга, Данскога і Сталінградскага — 330-тысячная групоўка Паўлюса і Гота была акружана і разгромлена. Дастойны ўклад у разгром фашысцкіх захопнікаў у бітве ля сцен волжскай цвярдыні ўнесла і 91-я асобная танкавая брыгада Івана Якубоўскага, якая змагалася тут больш за чатыры месяцы.

Камандуючы 3-й гвардзейскай танкавай арміяй генерал Павел Сямёнавіч Рыбалка адгукаўся пра гэтыя падзеі так: «Там, дзе Якубоўскі, там я спакойны, там абавязкова будзе поспех» .

Злучэнні гэтай танкавай арміі выканалі вялікую ролю ў барацьбе з ворагам і на Арлоўскім напрамку. Яны актыўна садзейнічалі войскам Бранскага і Цэнтральнага франтоў у разгроме мцэнскай, крамской і арлоўскай груповак ворага. Асобная танкавая брыгада Івана Якубоўскага не раз атрымлівала адказныя баявыя задачы і з поспехам іх выконвала. Курская бітва перарасла ў грандыёзнае стратэгічнае наступленне савецкіх войск.

Пачалося вызваленне левабярэжнай Украіны. На поўдзень ад Кіева, супраць Вялікага Букрына, паўстаў плацдарм. Войскі сыходзіліся ў лютых атаках. Гітлераўцы сціскалі падкову небяспечнага для іх плацдарма, не шкадуючы людзей і металу. Брыгада Якубоўскага на плацдарме — часцінка вялікага і адзінага цэлага. Генерал-фельдмаршал Манштэйн спазнаў савецкіх танкістаў і пад Сталінградам, і на Курскай дузе. Цяпер яны нацэліліся на Кіеў. Манштэйн разважаў так: савецкі Вярхоўны не пасылае танкавую гвардыю на другарадныя ўчасткі. Удар па Кіеву будзе адсюль, толькі адсюль! Манштэйн перакідвае да Вялікага Букрына свае галоўныя сілы. Тым часам танкавая армія П.С. Рыбалкі таемна ад ворага здымаецца з плацдарма і накіроўваецца да Люцежа, дзе на самай справе намечаны галоўны ўдар па кіеўскай групоўцы. Немцы не здолелі разгадаць гнуткую стратэгічную задумку савецкага камандавання і па-ранейшаму кідалі рэзервы да Букрына.

Люцеж! Адсюль вырашана нанесці масіраваны ўдар з мэтай вызвалення Кіева і разгрому Задняпроўскай групоўкі. Танкавая брыгада І.І. Якубоўскага адкрыла начны марш. Вызваленне Кіева, як вядома, заняло ўсяго трое сутак, з 3 па 6 лістапада. Гэта была бліскучая аперацыя, праведзеная ў імклівым тэмпе, нечаканая, масіраваная, не разгаданая праціўнікам, нягледзячы на буйное сканцэнтраванне савецкіх войскаў.

Трэцяя гвардзейская танкавая армія рашучымі дзеяннямі перарэзала шляхі адыходу саперніку на захад, стварыла пагрозу яго акружэння ў раёне Кіева. Танкавыя злучэнні імкліва развівалі наступленне на поўдзень — на Васількоў і Фастаў. Фастаў — буйны чыгуначны вузел, як бы цэнтр камунікацыйных нерваў. Простага позірку на карту дастаткова, каб зразумець яго значэнне. І.І. Якубоўскі зарэкамендаваў сябе тут удумлівым, ініцыятыўным і арганізаваным афіцэрам.

Наведваючы родныя мясціны, заўсёды казаў: «Калі што, звяртайцеся». І сапраўды дапамагаў усім, хто прасіў яго аб дапамозе.

У яго моцная воля, але, патрабуючы таго ж ад падначаленых, ён ніколі не квапіцца на іх асабістую годнасць. Ён верыць байцам і афіцэрам і разумна беражэ іх, і яму адказваюць суровай салдацкай любоўю. Да таго часу, а ішоў ужо трэці год вайны, у Якубоўскага склаўся і свой індывідуальны «почырк»: за ім замацавалася слава майстра дзёрзкіх танкавых рэйдаў. У манеўранай вайне Якубоўскі змог разгарнуць свае незвычайныя здольнасці. Танкавыя злучэнні, якімі ён камандаваў, не раз былі выкарыстаныя як зруйнавальны сталёвы клін, што рассякаў праціўніка, расчышчаючы шлях для наступных бранявых валоў танкавага патоку.

Далейшае развіццё падзей дазволіла ўбачыць у Якубоўскім не толькі майстра танкавых рэйдаў. Калі праціўнік, засяродзіўшы буйныя сілы танкаў, хацеў вярнуць горад Фастаў, Якубоўскі арганізаваў сапраўды сталёвы абарончы пояс і вытрымаў трохдзённыя адчайныя атакі пераўзыходзячых сіл танкавай дывізіі ворага, падтрыманай масіраванымі налётамі штурмавікоў.

Не ўдалося гітлераўцам вярнуцца да Дняпра. Дзесяць выхаванцаў брыгады Якубоўскага сталі Героямі Савецкага Саюза. Вось узнагародны ліст і на палкоўніка І.І. Якубоўскага, падпісаны камандуючым 3-й гвардзейскай танкавай арміяй генерал-лейтэнантам П.С. Рыбалкам і членам Ваеннага савета арміі генерал-маёрам С.І. Мельнікавым: «Камандуючы 91-й асобнай танкавай брыгадай з першых дзён яе арганізацыі тав. Якубоўскі шмат прыклаў сілы і энергіі па арганізацыі асабовага складу брыгады і па падрыхтоўцы яе да баявых дзеянняў. У Арлоўскую аперацыю арміі на Бранскім і Цэнтральным франтах (ліпень-жнівень 1943 года) брыгада пад кіраўніцтвам тав. Якубоўскага ўсе баявыя задачы выканала. У аперацыі арміі па фарсіраванні р. Днепр і ў баях па авалоданні гарадоў Кіеў і Фастаў тав. Якубоўскі пастаянна знаходзіўся ў баявых парадках брыгады, умела кіраваў брыгадай у самых складаных умовах бою. Брыгада пад кіраўніцтвам тав. Якубоўскага смелымі, рашучымі дзеяннямі авалодала 6.11.43 г. горадам Фастаў, нанёсшы ворагу вялікія страты ў жывой сіле і тэхніцы, за што брыгаду сталі называць «Фастаўскай».

Першая Зорка Героя Савецкага Саюза ўвянчала ратную працу чалавека, які дзень і ноч, суткі і месяцы праводзіў або ў танку, або на бронетранспарцёры, або ў самаходцы, або ў штабной машыне. Ён еў з агульнага катла, спаў пад брызентам, сагреваючыся цяплом танка, якое яшчэ захавалася пасля бою. На ім часцей быў скураны шлем, чым фуражка, і напагатове пісталет, пара «лімонак» на выпадак і аўтамат з набітым патронамі дыскам.

Іван Ігнатавіч заўсёды быў гатовы да вырашэння самых нечаканых і складаных задач, заўсёды быў скіраваны да перамогі. Потым былі баі за Корасцень, Жытомір, у азнаменаванне вызвалення якога брыгада была ўдастоена ордэна Чырвонага Сцяга, за Праскураў, Ярмолінку, Цярнопаль, дзясяткі гарадоў і сотні паселішчаў Правабярэжнай Украіны. Гэта было зімой і вясной 1944 года. Затым быў Львоўскі напрамак.

У той час І.І. Якубоўскі быў намеснікам камандзіра 6-га гвардзейскага танкавага корпуса, які, дзейнічаючы наперадзе галоўных сіл арміі, сышоў у глыбокі рэйд, вызваліў намечаныя пункты і перарэзаў камунікацыі праціўніка ад Львова на Яраслаў і Перамышль. Гэты горад, размешчаны на рацэ Сан, быў крэпасцю, вядомай яшчэ з часоў Першай сусветнай вайны. Яе ўмацаванні захаваліся. Мадэрнізаваныя і прыстасаваныя да ўмоў сучаснасці, яны адказвалі паняццю «моцны арэшак», які, здавалася, проста не разгрызці. Ды танкісты Якубоўскага разгрызалі.

Наперадзе — Берлін

У сваіх «Запісках камандуючага фронтам. 1943-1944 гг.» Маршал Савецкага Саюза І.С. Конеў расказваў:

> *«2 жніўня, пераправіўшыся праз Віслу, я вырашыў праверыць характар дзеянняў нашых войск па пашырэнні плацдарма. Мяне галоўным чынам цікавіў правы фланг нашай групоўкі. Тут камандармам 3-й гвардзейскай танкавай арміі генералам П.С. Рыбалкам быў вылучаны перадавы атрад пад камандаваннем палкоўніка І.І. Якубоўскага. Заязджаючы на вышыні каля Сташува, я убачыў рослага танкіста, які стаяў ля дарогі. Я спыніў сваю машыну і высветліў, хто ён і якую мае задачу. Гэта быў палкоўнік І.І. Якубоўскі . Ён далажыў, што з'яўляецца камандзірам перадавога атрада і мае задачу высунуцца ў раён Сташува, каб знішчыць групоўку праціўніка, якая нядаўна тут контратакавала. Палкоўнік І.І. Якубоўскі вельмі грунтоўна далажыў абстаноўку, а яго рашучасць і ўпэўненасць у выкананні пастаўленай задачы склалі прыемнае ўражанне. Добра было ведаць, што нашымі танкістамі камандуюць такія смелыя, надзейныя і разумныя афіцэры».*

23 верасня 1944 года аб'яўляецца Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР. П.С. Рыбалка на тым жа Сандамірскім плацдарме ўручае І.І. Якубоўскаму другую «Залатую Зорку».

Апошні акт вялікай бітвы. Вюнсдорф! Адзін з мноства нямецкіх гарадкоў. Якубоўскі тут ненадоўга. Асабістая праверка часцей корпуса, сустрэча з камандзірамі, удакладненні, пастаноўка аператыўных задач. Вюнсдорф абстрэльваюць. Выпадковы снарад разрываецца зусім блізка ад Івана Ігнатавіча. Шафёр звяртае ўвагу — парваны бот, шмат крыві. Машына спынена. Генерал спрабуе ўстаць, але не можа. Яго вязуць у палявы шпіталь...

Так для яго скончылася Вялікая Айчынная вайна.

Адказныя дні

Пасля перамогі Іван Ігнатавіч Якубоўскі скончыў Ваенную акадэмію Генеральнага штаба. За гады пасляваеннай службы ў Савецкай Арміі ён прайшоў шлях ад генерал-маёра да Маршала Савецкага Саюза — гэтага звання быў удастоены ў 1967 годзе. У красавіку таго ж года прызначаны першым намеснікам міністра абароны СССР, у ліпені — Галоўнакамандуючым Аб'яднанымі ўзброенымі сіламі дзяржаў — удзельніц Варшаўскага дагавора.

Зразумела, гэта — не кабінетная праца.

Вось, напрыклад, праверка Паўднёвай групы войск. Яе праводзіць штаб Аб'яднаных узброеных сіл Варшаўскага дагавора. Групавая газета «Ленинское знамя» падрабязна распавядае пра вучэнні.

«Гэта адказныя дні. Тым больш што на заключны этап вучэнняў павінен прыляцець не хто-небудзь іншы, а сам Галоўнакамандуючы Аб'яднанымі ўзброенымі сіламі Варшаўскага дагавора — намеснік міністра абароны СССР, двойчы Герой Савецкага Саюза, Маршал Савецкага Саюза Іван Ігнатавіч Якубоўскі. Франтавік, легендарная ў войсках асоба, пра якую сярод ваеннага люду ходзіць маса ўсялякіх гісторый. Сур'ёзных і не вельмі. У якасці фінальнай «фішкі» гэтых манеўраў планавалася правесці навядзенне пантонна-маставой пераправы праз Дунай сіламі двух інжынерна-сапёрных батальёнаў Венгерскай народнай арміі і Паўднёвай групы войск», — піша ваенны журналіст Віктар Літоўкін.

Ці трэба казаць, што аперацыя гэтая, якая рэгулярна паўтаралася падчас візітаў высокіх ваенных чыноў узроўню міністра абароны, яго намеснікаў ці начальніка Галоўнага палітычнага ўпраўлення СА і ВМФ, даўно адпрацаваная сапёрамі абодвух бакоў практычна да аўтаматызму. Хоць паглядзець на іх работу, вядома ж, заўсёды цікава. Да абодвух берагоў Дуная ў досыць шырокім, метраў 500, месцы падыходзяць дзве калоны цяжкіх КрАЗаў з пантоннымі і рачнымі катарамі ў кузаве. Уся гэтая гаспадарка скідаецца ў ваду.

Міністр абароны СССР, Маршал Савецкага Саюза Андрэй Антонавіч Грэчка і Маршал Савецкага Саюза Іван Ігнатавіч Якубоўскі ў размяшчэнні 2-га батальёна 330-га танкавага палка 14-й Гвардзейскай мотастралковай дывізіі. 1968 г.

Пантоны раскрываюцца, салдаты заскокваюць у катары і, змагаючыся з плынню, сцягваюць бусакамі звёны пантонаў у адну лінію, злучаюць іх адмысловымі клямарамі і зацiскамі ў сталёвы наплаўны мост, па якім потым з аднаго берага на другі павінны ісці танкі і іншая бранятэхніка. Для ўзмацнення эфекту сапраўднага бою на пераправу пікіруюць ударныя верталёты і штурмавікі, у глыбіні выбухаюць, уздымаючы хвалі і тысячы пырскаў, глушачы заадно і рыбу, абліваючы сапёраў і баявую тэхніку халоднай дунайскай вадой, імітацыйныя боепрыпасы. Словам, хоць здымай чарговае «Вызваленне» або «Падзенне Берліна».

Аб чарговым навядзенні такога моста, сведкам чаго павінен стаць маршал Савецкага Саюза Якубоўскі, карэспандэнт газеты «Ленинское знамя» ўжо напісаў рэпартаж (балазе, загадзя пабываў на генеральнай рэпетыцыі сапёраў, пагутарыў з усімі, хто яму быў патрэбны, зрабіў неабходныя здымкі). Матэрыял стаяў у паласе, што называецца, быў заліты ў метал на стале ў вярстальшчыка. Патрэбен быў яшчэ толькі адзін кадр, на якім прысутнічаюць камандуючы групы Герой Савецкага Саюза генерал-палкоўнік Барыс Іваноў і, вядома ж, маршал Савецкага Саюза Іван Якубоўскі. Але праблема ў тым, што зрабіць гэты здымак можна было толькі падчас саміх вучэнняў, калі абодва военачальнікі будуць назіраць за навядзеннем пантонна-маставой пераправы.

Для таго каб журналіст паспеў зрабіць такі здымак і своечасова прывёз яго ў рэдакцыю, адказны рэдактар газеты палкоўнік Фёдар Канавалаў нават выдзеліў яму сваю персанальную машыну. І той, апрануты ў цывільнае, каб не зіхацець лейтэнанцкімі пагонамі перад генераламі і палкоўнікамі, не нарывацца на заўвагі і недарэчныя прыдзіркі, маячыў перад драўлянай трыбунай, збудаванай на беразе Дуная, недалёка ад таго месца, дзе планавалася наводзіць пераправу. Маршал Якубоўскі і генерал Іваноў ужо стаялі на гэтай трыбуне, але сфатаграфаваць іх не было ніякай магчымасці, вакол круцілася столькі ваеннага народу, што выхапіць кадр, дзе былі б яны толькі ўдваіх, не ўяўлялася магчымым.

Батарэі біліся да апошняга снарада, мотастралкі кідаліся ў рукапашную. Былі моманты, калі танкі праціўніка даходзілі да камандпункта. Камандзір брыгады праяўляў моцную волю, уменне і вопыт. Ён давяраў байцам не менш, чым яны давяралі яму.

«Раптам на маё шчасце, піша Віктар Літоўкін, Якубоўскі прыабняў Іванова за плечы і павёў кудысьці ў бок ад трыбуны. Я крыху воддаль рушыў услед за імі. Аказалася, маршал вядзе генерала да... дашчатага туалета тыпу сарцір, як сказалі б цяпер. Ён адчыніў дзверы гэтага збудавання і... о, жах, не змог увайсці — дзверы былі занадта вузкімі для маршала, мужыка ростам пад два метры і вагой у добрых паўтара цэнтнера.

— Не мог ты, Іваноў, — пачуў я грамавы голас Якубоўскага, — нармальны ср...нік для Галаўкама паставіць!..

— Я разбяруся са сваімі сапёрамі, — апраўдваўся камандуючы, — але, думаю, ён пабудаваны па стандартах, зацверджаных галоўным інжынерным упраўленнем.

— Чорт бы пабраў гэтыя стандарты, — раззлаваўся Якубоўскі і рашуча пакрочыў у кусты.

Праз пару хвілін военачальнікі выйшлі з зараснікаў. Я падскочыў да іх:

— Таварыш Маршал Савецкага Саюза, дазвольце сфатаграфаваць вас з камандуючым ПГВ для нашай групавой газеты.

— Валяй, — скамандаваў мне Якубоўскі. Злосць яго кудысьці выпарылася, ён быў настроены ўжо больш чым прыязна...»

Жарты жартамі, але час і абстаноўка ў свеце тады былі зусім не жартоўнымі. Супрацьстаянне двух ваенна-палітычных блокаў, дзвюх сістэм патрабавала пастаяннага напружання сіл. І маршал заўсёды ў дарозе. Наперадзе былі і чэхаславацкія падзеі...

Не забываўся Іван Ігнатавіч і пра Беларусь, памятаў пра сваіх землякоў. Добрае стаўленне да тых, хто вырас побач з ім, ён захаваў на ўсё жыццё. Наведваючы родныя мясціны, заўсёды казаў: «Калі што, звяртайцеся». І сапраўды дапамагаў усім, хто прасіў яго аб дапамозе. У кожнага з іх захаваліся свае ўспаміны пра тое, як Якубоўскі ўжо пры ўсіх сваіх званнях і ўзнагародах прыехаў, напрыклад, на адкрыццё Музея савецка-польскай баявой садружнасці ў Леніна. Антаніна Якубоўская (яе бабуля Агаф'я Захараўна замяніла калісьці Івану Ігнатавічу маці) успамінала:

— Мой тата падышоў да яго і прама прапанаваў: «Іван, я самагонкі выгнаў, зойдзеш?». А там жа — куча людзей і некалькі шэрагаў міліцыі стаяла. Адзін з іх схапіў бацю, але маршал паспеў яму своечасова руку падаць. Абняліся. Тата быў высокі, але худы, а Іван Ігнатавіч — вельмі здаровы. Настолькі, што мой бацька баяўся задыхнуцца ў гэтых абдымках.

Якубоўскі прыехаў з вялікім мяшком цукерак. У кожную дзіцячую далоньку насыпаў па добрай жмені. Дзятва была шчаслівая. Запомніліся яго шырокія штаны, у іх маглі змясціцца ці не чацвёра хлапчукоў. Потым дарослыя за агульным сталом спявалі песні...

...Ён сышоў з жыцця 30 лістапада 1976 года ва ўзросце 64 гадоў. Яны, генералы і маршалы, якія вынеслі на сабе ўвесь цяжар Вялікай Айчыннай, згаралі рана. Пахаваны Іван Ігнатавіч на Краснай плошчы. Урна з прахам маршала змешчана ў сцяне Камунараў. Сярод яго ўзнагарод — 15 савецкіх ордэнаў, у тым ліку чатыры ордэны Леніна, чатыры — Чырвонага Сцяга, два — Суворава II ступені, 13 савецкіх медалёў, а таксама шматлікія ўзнагароды еўрапейскіх дзяржаў. Імя Якубоўскага носяць вуліцы ў Мінску, Магілёве, Оршы, Асіповічах, Бялынічах, Горках. Бронзавыя бюсты двойчы Героя Савецкага Саюза Івана Ігнатавіча Якубоўскага былі ўстаноўлены ў Мінску і ў горадзе Горкі Магілёўскай вобласці.

Анатоль СЛАНЕЎСКІ.